

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №3 (11)
Студзень 2021

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **Акцыя “Птушкі на кармушцы”** | **Стар. 1** |
| **Навіны дзіцячага сада** | **Стар. 2** |
| **Школьная майстэрня** | **Стар. 3** |
| **Дзяржынская лыжня - 2021** | **Стар. 3** |
| **Шосты школьны дзень** | **Стар. 4** |

## Акцыя “Птушкі на кармушцы”








Вучні школы не засталіся ўбаку ад добрых спраў і прынялі ўдзел у акцыі "Птушкі на кармушцы".

Мэта акцыі - нагадаць усім, як важна падкармліваць птушак падчас халадоў. Знайсці корм пад снегам - няпростая задача, да таго ж птушкам зімой трэба больш энергіі на абаграванне, а значыць, і ежы. Лепшы корм для прадстаўнікоў сямейства вераб'іных - чорныя несалёные семечкі. Чысціць іх не трэба. Можна зрабіць сумесь: семечкі сланечніка, проса і авёс. Сініцы і дзятлы з задавальненнем ядуць несалёнае свежае сала, вераб'і, зелянушкі, чыжы любяць паласавацца арахісам.

Не заставайцеся ўбаку і Вы! Пакарміце птушак зімой!

# Навіны дзіцячага сада

## Калектыўная аплікацыя “Мая вёска”





## Зімовыя забавы

Сапраўднае зімовае надвор'е дазволіла выхаванцам дзіцячага сада сумесна з выхавальнікам Пратасевіч Святланай Сяргееўнай прыняць удзел у раённай ініцыятыве "Зімовыя забавы". На гульнявой пляцоўцы былі створаны снежныя скульптуры і лабірынты.








## Фізічнае выхаванне: зарадка





# Школьная майстэрня

Вучні школы пад кіраўніцтвам дырэктара, а па сумяшчальніцтву і настаўніка працоўнага навучання, Аляксандра Сяргеевіча Крыварота і настаўніка фізічнай культуры Аляксандра Аляксандравіча Рыбака майстравалі на ўроках працы хакейныя клюшкі. Па-сапраўднаму зімовае надвор'е за вакном так і вабіць правесці вольны час з сябрамі за гульнёй у хакей, зладзіўшы аматарскае спартыўнае спаборніцтва!








# Дзяржынская лыжня -2021

Традыцыйна ў студзені ў Дзяржынскім раёне праходзяць спаборніцтвы па лыжных гонках "Дзяржынская лыжня" ў рамках Сусветнага дня снегу. У 2020 годзе спаборніцтвы не праводзіліся з-за адсутнасці снежнага покрыва. У бягучым 2021 зіма радуе нас і маразамі, і снегам, таму спаборніцтвы прайшлі 23 студзеня пры добрым, камфортнай надвор'і і выдатным настроі удзельнікаў.

У спаборніцтвах прымалі ўдзел каманды арганізацый і ўстаноў Дзяржынскага раёна. Нашу школу на "Дзяржынскай лыжні-2021" прадстаўлялі настаўнік фізічнай культуры Рыбак Аляксандр Аляксандравіч і настаўнік французскай мовы Баркоўская Галіна Іванаўна.





# Шосты школьны дзень

16 студзеня навучэнцы школы прынялі ўдзел у праблемным дыялогу з элементамі трэнінгу "Давайце разумець адзін аднаго". У ходзе гэтага мерапрыемства рабяты вучыліся навыкам зносін, уменням вырашаць праблемныя пытанні, саступаць адзін аднаму, разгледзелі такія паняцці як сяброўства, узаемадапамога, супрацоўніцтва, абмеркавалі правілы паводзінаў у грамадстве, з сябрамі і бацькамі. Падчас трэнінгу навучэнцы разбіраліся, што дапамагае ў зносінах, а што перашкаджае.





30 студзеня вучні, якія наведваюць гурток "Спартыўныя гульні", правялі час на свежым паветры, катаючыся на лыжах і гуляючы ў хакей.






У гэты ж час самыя спартыўныя прадстаўнікі нашай школы прымалі ўдзел у раённых спаборніцтвах па зімовым шматбор'і "Здароўе".






Рэдкалегія: вучні 9 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 9 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 27 лютага.